# Рэцэнзіі

В. Н. Р я б ц е в и ч. **Нумизматика Беларуси.** Мн.: «Полымя», 1995. 687 с.

Выйшла з друку фундаментальная навукова-папулярная праца вядомага даследчыка-нумізмата Валянціна Навумавіча Рабцэвіча «Нумизматика Беларуси». Беларускім аматарам гісторыі (і не толькі) гэтае імя добра вядома ў першую чаргу па кнізе «О чем рассказывают монеты» (два выданні агульным тыражом 225 тыс. экз.).

Новая кніга, прысвечаная гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі нашай краіны, з'яўляецца энцыклапедычнай працай па аднаму з цікавейшых накірункаў гістарычнай навукі.

Першыя дзве главы («Товар и деньги» і «Монета и клад») у папулярнай форме апавядаюць аб праблемах «агульнай» нумізматыкі: сутнасці грошай, іх паходжанні, манеце і пытаннях тэзаўрацыі скарбаў. Тэкст насычаны надзвычай цікавымі сюжэтамі, якія адразу прыцягваюць увагу чытача, уводзяць яго ў свет складаных эканамічных і фінансавых катэгорый, утрымліваюць займальныя прыклады з грашовага абарачэння розных краін на працягу многіх стагоддзяў.

Наступныя (III—X) главы, прысвечаныя гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі, апавядаюць пра канкрэтныя нумізматычныя помнікі з моманту з'яўлення тут першых антычных манет (I—III ст. н. э.) да сучаснасці.

Перад чытачом шматразова паўстаюць маляўнічыя сцэны штодзённага жыцця насельніцтва Беларусі, звязаныя з тpraнай, грашовай, крымінальнай і іншымі сферамі. Чытач пераканаецца, што нашы продкі неаднойчы пакутвалі ад крызісаў фінансавай сістэмы і інфляцыі, даволі будзённай справай была фальсіфікацыя сродкаў грашовага абарачэння, даведаецца об аферах, якія часта суправаджалі манетную вытворчасць і грашовае абарачэнне. Пад час знаёмства з кнігай чытач яшчэ раз пераканаецца ў тым, якім дынамічным, цікавым і разам з тым драматычным жыццём насычана гісторыя нашай Айчыны; якія каштоўныя помнікі хавала і працягвае хаваць беларуская зямля, атрымае ўяўленне аб тым, наколькі інфармацыйнымі з'яўляюцца рэлікты грашовага абарачэння і, спадзяюся, адчуюць неабходнасць навуковых і ашчадных адносін да іх.

Асобныя месцы кнігі па сваёй займальнасці, без сумнення, могуць сапернічаць з дэтэктыўным жанрам. Пры гэтым займальнасць ніякім чынам не перашкаджае навукова-дакладнаму асвятленню самых складаных аспектаў гісторыка-нумізматычнага мінулага Беларусі.

Прыкладна палову аб'ёму кнігі займаюць даведачна-дапаможныя матэрыялы (восем дадаткаў). Гэта падрабязны манетны каталог (пералік і фатаграфіі манет), разнастайныя геральдычныя матэрыялы, спісы манетных двароў, прадукцыя якіх мае адносіны да грашовай гаспадаркі і абарачэння на Беларусі. Гэтыя матэрыялы не толькі выдатна дапаўняюць тэкставую частку працы: кожны з дадаткаў мае сваю адмысловую каштоўнасць, бо дае ўяўленне аб малавядомых баках грашовых вытворчасці і абарачэння. На мой погляд, найбольшую цікавасць выклікаюць фатаграфіі манет (пераважна двухбаковыя) агульным лікам каля 1600 экз.; па колькасці і падбору фатаграфій манет рэцэнзуемае выданне з'яўляецца унікальным, частка выяў манет упершыню друкуецца на Беларусі.

Разам з тым нельга абыйсці і недахопы працы. Так, аўтар часам надта захапляецца цытаваннем аўтэнтычных тэкстаў, якія, на наш погляд, можна было б пераказаць, што аблегчыла б іх успрыманне чытачамі.

Сустракаюцца і пэўныя супярэчнасці. Напрыклад, на с. 181 адзначаецца:

«Со второй половины XIV в. экономическое (а следовательно, и финансовое) положение Великого княжества Литовского... стало заметно ухудшаться», у той жа час на с. 182 аўтар сцвярджае, што пры Жыгімонце III Вазе (1587—1632): «Финансы Речи Посполитой достигли невиданного (как в предыдущей, так и в последующей ее истории) расцвета».

Недарэчным з'яўляецца сцвярджэнне, што ў 1918 г. Вільна ўваходзіла ў склад Польшчы (с. 7). Узгадваецца Мар'інагорскі раён замест Пухавіцкага (с. 149). Падзеі ў кнізе датуюцца як па юліянскаму, так і па грыгарыянскаму стылям, але гэты момант аўтарам не агаворакы. На с. 283 узгадваецца прозвішча «Пжелацкі», правільна будзе — Пржэплаўскі...

Рэдактарскія памылкі таксама не ўпрыгожваюць кнігу, але, канешне, не могуць паўплываць на яе навуковыя якасці. Прываблівае мастацкае афармленне кнігі, прафесійна выкананае мастаком П. П. Казеем.

Можна меркаваць, што кніга выкліча жывы інтарэс студэнтаў і выкладчыкаў гуманітарных факультэтаў ВНУ, настаўнікаў і вучняў старэйшых класаў сярэдніх навучальных устаноў, навукоўцаў, супрацоўнікаў музеяў, краязнаўцаў, калекцыянераў манет і, увогуле, аматараў гісторыі не толькі ў нас, але і за межамі Беларусі.

**В. С. Касмылёў.**

**Экологическая мысль восточных славян. Антология.** Мн.: Издательское ООО «Красико-Принт», 1995. 800 с.

На пороге нового тысячелетия определяющей доминантой философского осмысления действительности становятся императивы гуманистически ориентированного сознания и социального действия. Все явственнее усиливается процесс экологизации самого гуманизма. Человечеству приходится ныне вести не просто поиск оптимальных средств продвижения по пути социального прогресса, но со всей серьезностью прежде всего заботиться о базовых истоках собственного бытия. Одна из ведущих тенденций мирового развития проявляется в нарастании интеграционных процессов, охватывающих практически все сферы жизни. Вступление социальной эволюции в новую, постиндустриальную, фазу предполагает осознание планетарного воздействия человека на природную среду и осмысление великой ответственности за сохранение природы, за выживание самого человечества, ответственности, которая легла на плечи ныне живущих поколений. Экологическая опасность стала, пожалуй, главной угрозой самому существованию человека как биологического вида. Задачу ее преодоления нельзя считать технико-технологической проблемой. Ее разрешение нужно связывать не только с развитием материало- и энергосберегающих технологий и экологически чистых производств. Экология имеет еще и ярко выраженную социально-культурную размеренность, включая в себя исторически сложившиеся представления о социально-природном взаимодействии, зафиксированные в культуре и практике различных народов.

Актуальность рецензируемого труда, выполненного коллективом НИЛ социально-экологических исследований при кафедре философии и методолгии науки Белгосуниверситета под руководством профессора А. И. Зеленкова, трудно переоценить. Обращение авторов-составителей к экологической мысли восточных славян более чем своевременно. Составители совершенно справедливо рассматривают культуры восточных славян как специфическую целостность, как особое пространство встречи Запада и Востока.

В антологии собран большой материал. По сути, данный труд представляет собой широкую панораму развития экологических представлений белорусского, русского и украинского народов в течение многих веков.

Тщательно продуман порядок компоновки материала. В антологии синтезированы принцип исторической эволюции социально-экологических представлений, характерных для архаической эпохи, классического периода и современности, с одной стороны, и принцип предметно-содержательной дифференциации каждого из исследуемых национальных типов экокультуры на научную, художественную, мифологическую, философскую, религиозно-нравственную формы их воплощения — с другой.

Открывает книгу содержательное введение «Методологические основания исследования структуры и динамики экологического сознания восточных славян» (А. И. Зеленков, М. А. Можейко).

Материал антологии распределен по пяти разделам: «Единство человека и природы как исконная ценность восточнославянских культур» (составители: В. В. Анохина, Е. В. Хомич); «Идеал экосоциальной гармонии в белорусской культуре классического периода» (А. П. Ждановский, А. О. Пешков, М. А. Можейко); «Специфика и приоритеты украинского экосознания» (В. С. Крисаченко, М. А. Можейко); «Экологические ценности и ориентации в классической русской культуре» (Е. В. Хомич, М. А. Можейко, А. О. Пешков); «Судьбы экосознания в советской культуре» (В. Н. Фурс, М. А. Можейко).

Антологию отличает особая тщательность в подборе текстов. Можно